народы і асобы, якія валодаюць вялікімі дабротамі, павінны паступіцца часткай гэтых даброт на карысць іншых народаў і грамадзян, у тым ліку і не вельмі забяспечаных грамадзян Беларусі. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС у жорсткай форме нагадала аб узаемнай залежнасці ўсіх народаў: радыёактыўныя хмары, як вядома, не ведаюць межаў.

Гуманнае пераразмеркаванне матэрыяльных даброт будзе галоўнай гарантыяй захавання грамадскага парадку, які забяспечвае асноўныя свабоды і правы асобы. А менавіта такі парадак заслугоўвае, каб яго сцвярджалі і захоўвалі. І толькі тады, калі выкананне гэтага прынцыпу будзе забяспечана ва ўсіх еўрапейскіх краінах, можна будзе з поўным заснаваннем гаварыць аб стварэнні «агульнаеўрапейскага дома».

Але так сказаць, напэўна, мала. Неабходна руплівa «адсартаваць» з еўрапейскага і саюзнага вопыту тое, што падыходзіць да беларускай спецыфікі, і вызначыць тое, што не прыгодна наогул ці можа быць рэалізавана пазней, у будучым. Патрэбны новыя, набліжаныя да нашых рэалій ідэі, ідэі смелыя і неардынарныя. У першую чаргу, неабходна прызнаць, што нават самая ўражальная ідэя «агульнаеўрапейскага дома» будзе мёртвай да таго часу, пакуль яна не напоўнена канкрэтным зместам. Менавіта таму Еўропа дастаткова халаднавата рэагуе на нашы, нават самыя цікавыя, бясспрэчна, важныя ініцыятывы.

Думаецца, суверэнная Беларусь можа садзейнічаць умацаванню суполкі еўрапейцаў. Важнай прадмовай гэтага можа быць гарантыя непарушнасці межаў у Еўропе. Рэспубліка Беларусь не мае тэрытарыяльных дамаганняў да іншых дзяржаў.

Урад рэспублікі павінен праводзіць палітыку, якая накіравана на замену ваенных саюзаў надблокавымі структурамі, што ўтвараюць зародак агульнаеўрапейскай сістэмы бяспекі. Наказам часу мы лічым распаўсюджванне паняцця бяспекі на сферу эканомікі, навакольнага асяроддзя, культуры, навукі і тэхналогіі.

Беларусь ужо зараз адмаўляецца ад валодання ядзернай, бактэрыялагічнай і хімічнай зброяй і размяшчэння яе, імкнецца да таго, каб аналагічныя мэты мела адзіная Еўропа.

Дасягнуты ўзровень дэмакратыі ў Беларусі звязаны з ажыццяўленнем правоў чалавека. Новы патрыятызм павінны выяўляць нашу прыхільнасць асноўным правам, абвешчаным Канвенцыяй аб правах чалавека.

На наш погляд, урад рэспублікі можа весці перагаворы аб распаўсюджванні сферы дзеяння ЕС на сённяшнюю суверэнную Беларусь. Асабліва важнае значэнне гэта будзе мець для нашай сельскай гаспадаркі, сацыяльных і экалагічных праграм.

Аб'яднаная Еўропа павінна спрыяць працэсам замацавання міру і ўзаемаразумення на планеце. Дапушчальным інструментам гэтага з'яўляюцца нарады пад эгідай Еўрапейскага палітычнага супрацоўніцтва. Беларусь павінна хадайнічаць аб прадстаўленні ёй права ўдзельнічаць у гэтых пасяджэннях. Доўгатэрміновай мэтай Беларусі павінна стаць імкненне да стварэння справядлівага эканамічнага парадку, які адкрывае перад усімі народамі светлыя эканамічныя перспектывы.

Галоўным базавым момантам для далейшага канструявання «агульнаеўрапейскага дома» з'яўляецца, вядома, дакладнае разуменне таго, у чым еўрапейскія краіны маюць патрэбу ў першую чаргу, у чым можа выяўляцца іх зацікаўленасць у такім «доме», што іх аб'ядноўвае. На гэтае пытанне адназначна адказаць цяжка ўжо таму, што інтарэсы еўрапейскіх краін вельмі разнастайныя. Таму, мусіць, працэс агульнаеўрапейскага будаўніцтва зойме шмат часу. Чым больш разнастайнай будзе гама палітычных, грамадскіх і рэлігійных сіл, якія ўдзельнічаюць у ім, чым глыбей укараніцца ў іх асяроддзе ідэя «агульнаеўрапейскага дома», тым эфектыўней будуць вынікі.

В. М. МАЦЕЛЬ

## АГРАРНАЯ РЭФОРМА Ў КІТАЙСКАЙ ВЁСЦЫ (1978—1988)

Пасяховае ажыццяўленне эканамічнай рэформы ў сельскай гаспадарцы дазволіла Кітайскай народнай рэспубліцы ў сціслыя тэрміны выйсці на перадавыя рубяжы па вытворчасці прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. Так, сярэднегадавая вытворчасць зерня ў краіне дасягнула амаль 400 млн. т [1], што вывела краіну на адно з першых месц у свеце па вытворчасці гэтага віду сельскагаспадарчай прадукцыі.

Найважнейшай гістарычнай падзеяй на шляху радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, якія аказалі кардынальнае ўздзеянне на ўсе галіны народнай гаспадаркі краіны, стаў III пленум адзінаццатага склікання ЦК КПК, які адбыўся ў снежні 1978 г. Асудзіўшы «культурную рэвалюцыю» як лявацкі перагіб, кіраўніцтва краіны на чале з Дэн Сяопінам прыняло рашэнне аб правядзенні шэрагу рэформ, мэта якіх — вывесці краіну з найцяжэйшага эканамічнага крызісу, накарміць, апрануць і абуць мільярдны народ. Па ацэнцы амерыканскіх кітаязнаўцаў, на канец 70-х гг. прыблізна 200 млн. кітайцаў пакутвалі ад недаядання [2].

Пачатак рэформы паклалі рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы — асноўнай галіне эканомікі, дзе працуе амаль 80 % насельніцтва краіны. «Народныя камуны» з сістэмай харчавання з «адзінага катла» і ўраўняльным прынцыпам размеркавання, якія поўнасцю адчужалі работнікаў ад сродкаў вытворчасці, былі распушчаны. Кітайская вёска стала арэнай шырокага, у цэлым паспяховага выкарыстання падворнага, ці сямейнага, падраду. Пераход сялянства на новыя формы арганізацыі працы і вытворчасці атрымаў агульную назву «сістэма вытворчай адказнасці». Яе асновай стаў калектыўны, ці звенняві, падрад. Сутнасць яго заключалася ў тым, што звяно, якое поўнасцю выконвала ўстаноўлены брыгадай план вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, за перавыкананне задання атрымлівала пэўную грашовую прэмію або частку звышпланавай прадукцыі, што заставалася пасля ўсіх разлікаў звяна, якая размяркоўвалася паміж усімі членамі ў залежнасці ад іх асабістага працоўнага ўкладу. У той жа час у цяжкадаступных, аддаленых, у першую чаргу горных раёнах краіны, дзе выкарыстанне калектыўнага падраду было нерэальна, рашэннямі пленума дазвалялася скарыстоўваць як выключэнне сямейны, ці падворны, падрад.

Паколькі ў розных правінцыях, паветах і нават асобных раёнах існавалі розныя эканамічныя і палітычныя ўмовы, пастолькі права на існаванне атрымалі самыя разнастайныя варыянты сістэмы вытворчай адказнасці. Аднак усіх іх радніла тое, што паўсюдна на першым плане знаходзіліся прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці працаўнікоў у выніках сваёй працы, выхаванне павагі да правоў уласнасці і дазвол поўнай свабоды ў прыняцці рашэнняў. Усе формы вядзення гаспадаркі ўлічвалі спецыфіку мясцовых умоў.

Поспех аграрнай рэформы ў кітайскай вёсцы шмат у чым быў прадвызначаны намаганнямі ўрада краіны па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, павышэнню закупачных цэн на асноўныя віды сельскагаспадарчай прадукцыі, ажыўленню сельскіх кірмашоў, укараненню дасягненняў навукі і перадавой практыкі ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Значна палепшылася матэрыяльна-тэхнічнае аснашчэнне вёскі. Так, колькасць машынна-трактарнага парку павялічылася з 2004 тыс. адз. у у 1978 г. да 6891 тыс. адз. у 1986 г., ці больш чым у 3 разы, колькасць збожжаўборачных камбайнаў узрасла ў 1,6 разы [3]. Агульны энергабаланс сельскай гаспадаркі дасягнуў на канец 1987 г. 247,2 млн. квт. г, ці на 50 % болей, чым у 1982 г. У той жа час з укараненнем сістэмы вытворчай адказнасці развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі Кітая пайшло ў новым напрамку. Пачаў зніжацца попыт на магутныя сельскагаспадарчыя машыны і абсталяванне: сяляне ўсё часцей набывалі сельскагаспадарчую тэхніку малой магутнасці і паўмеханізаваную (напрыклад, трактары малой магутнасці 12—18 л. с. і матаблокі 4—12 л. с., вадапомпы, сушылкі).

Гэта тлумачылася тым, што такімі машынамі, з аднаго боку, нескладана кіраваць і адначасова іх няцяжка рамантаваць, з другога (і гэта галоўнае) — каштуюць яны адносна нядорага і адпавядаюць маштабам сельскагаспадарчай вытворчасці (сярэдні памер сялянскай дзялянкі 0,5 га), тэхнічнаму, эканамічнаму і культурнаму ўзроўню саміх сялян. На канец 1987 г. трактары малой магутнасці і матаблокі складалі 85,8 % агульнай колькасці трактароў у сельскай гаспадары КНР [4].

У цэлым жа ўзровень механізацыі сельскай гаспадаркі краіны невысокі: з 144 млн. га агульнай пасяўной плошчы ў 1987 г. было ўзарана толькі 40,5 млн. га, а плошча засеянага поля склала ўсяго толькі 13,1 млн. га [5].

Усё болей удзяляецца ўвагі ўкараненню перадавых навукова-тэхнічных дасягненняў у сельскагаспадарчую вытворчасць. Яскравым пацвярджэннем таму служыць праграма «Іскра», прынятая ўрадам у 1985 г. З мэтай актывізацыі навуковай працы на сяле, удасканальвання структуры і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў рамках гэтай праграмы на працягу 1986—1987 гг. былі выкананы працы па 372 тэмах агульнанацыянальнага і 2500 тэмах рэгіянальнага значэння. У выніку іх рэалізацыі за два гады атрымана дадат-

кова прадукцыі на суму 7,39 млрд. юаняў [6]. У ажыццяўленні праграмы «Іскра» прынялі ўдзел больш за 400 тыс. навукова-тэхнічных кадраў, што ўвайшлі ў сельскагаспадарчую вытворчасць з навукова-даследчых інстытутаў вялікіх гарадоў.

Дзейсным стымулам ўзмацнення матэрыяльнай зацікаўленасці кітайскага сялянства ў павелічэнні вытворчасці і продажу сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве сталі грунтоўныя змены ў палітыцы закупачных цэн. Яны былі падняты ў сярэднім на 20 %, пры гэтым павышэнне іх на звышпланавую прадукцыю склала ад 80 да 88 % [7].

Комплекс мер, распрацаваных кіраўніцтвам Кітая па ўздыму сельскай гаспадаркі, прывёў да паспяховага ўкаранення ў вёсцы сістэмы вытворчай адказнасці. У той жа час сяляне, аналізуючы і супастаўляючы на асабістым вопыце розныя віды гэтай сістэмы, большую перавагу аддавалі сямейнаму падраду, чым звеннявому, які не ліквідаваў канчаткова ўраўнілаўкі ў размеркаванні. Сямейны ж падрад даваў селяніну магчымасць (пасля таго як ён разлічыцца з дзяржавай па кантракту) прадаваць лішкі прадукцыі або той жа дзяржаве, але ўжо па дагаворных цэнах, або на кірмашы, дзе цэны былі ў некалькі разоў вышэй за дзяржаўныя. Улічваючы настрой большасці сялянства, урад краіны ў пачатку 1983 г. прыняў рашэнне аб паўсюдным пераходзе большасці брыгад на сямейны падрад. На пачатак 1984 года на падворную падрадную сістэму перайшло 99 % усіх сялянскіх сем'яў [8].

Укараненне сямейнага падраду садзейнічала выяўленню і ўздыму ўнутраных патэнцыялаў сельскай гаспадаркі краіны, у выніку чаго кітайская вёска выйшла са стану працяглага застою. Так, за шэсць гадоў рэформы (1979—1984) валавыя зборы збожжавых культур узраслі з 300 да 400 млн. т. І ў наступныя гады (1986—1988) гэтыя тэмпы амаль захаваліся [9]. Вытворчасць бавоўны за перыяд 1978—1986 гг. узрасла з 2,16 млн. т да 3,54 млн. т: павялічылася ў 1,7 разы. З імпарцёра сельскагаспадарчай прадукцыі Кітай ператварыўся ў яе экспарцёра.

Поспех аграрнай рэформы прывёў да значнага паляпшэння дабрабыту працаўнікоў сяла. Так, калі ў 1978 г. чысты гадавы даход кітайскага селяніна складаў 134 юані, дык у 1985 г.— ужо 424: павялічыўся ў 3,2 разы [10]. Амаль у тры разы павялічыліся за даследуемае дзесяцігоддзе і сярэднегадавыя расходы сялянства на выкарыстанне і куплю будаўнічых матэрыялаў. Рэформа рэзка змяніла аблічча вёскі. На месцы ранейшых хацін выраслі новыя дамы, прывычнымі ў сялянскім доме сталі швейная машына і веласіпед, радыёпрыёмнік і пральная машына. Амаль 90 % сялянства стала жыць у дастатку [11].

Аднак у апошнія гады тэмпы росту сельскагаспадарчай вытворчасці пачалі замаруджвацца, а валавыя зборы такіх найважнейшых культур, як рыс і бавоўна, нават зніжацца, скарацілася і вытворчасць мяса [12]. У 1988 г. вытворчасць зерня зменшылася на 9,2 млн. т у параўнанні з папярэднім годам, збор бавоўны і алею скараціўся адпаведна на 4,3 і 15,9 % [13].

Сярод прычын, якія прывялі аграрны сектар да пэўнага зніжэння тэмпаў, належыць выдзеліць у першую чаргу непрадуманую інвестыцыйную палітыку. У той час як тэмпы росту сельскагаспадарчай вытворчасці па меры ўкаранення сістэмы вытворчай адказнасці працягвалі ўзрастаць, памеры дзяржаўных капітальных укладаў год за годам пачалі скарачацца. Так, калі ў пачатку рэформы дзяржаўныя капітальныя ўкладанні ў аграрны сектар складалі каля 10 %, дык у 1987 г.— толькі 3 % [14]. Да таго ж і мясцовыя (правінцыяльныя, паватовыя) ўлады грашовыя сродкі, што прызначаліся для пад'ёму сельскай гаспадаркі, напраўлялі, як правіла, у больш прыбытковы (па іх меркаванню) індустрыяльны сектар. Вызначаная нестабільнасць палітычнай сітуацыі ў краіне ў канцы 80-х гг. прымусіла сялян прытрымаць назапашаныя зберажэнні да лепшых часін, чым укладаць іх у развіццё сваёй асабістай гаспадаркі.

Тормазам для росту сельскагаспадарчай прадукцыі ў канцы 80-х гг. стала і цэнавая палітыка. Павялічыўшы закупачныя цэны (у сярэднім на 20 %) у пачатку рэформы, урад пра іх больш не клапаціўся. Больш таго, рэкордны ўраджай 1984 г. стварыў ілюзію таго, што ўсе праблемы рэформы ўжо вырашаны і далейшае развіццё сельскай гаспадаркі будзе ісці толькі па ўзыходнай лініі. Замена ў 1985 г. сістэмы цэнтралізаваных закупак па кантрактных дагаворах з адначасовым увядзеннем свабоднай куплі і продажу ўсіх другіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі прывяло ў далейшым з-за нізкіх цэн на зерне і бавоўну да рэзкага павелічэння цэн на гародніну, тэхнічныя культуры, птушку, рыбу [15]. Гэтыя фактары прымусілі сялян пераключыцца з менш рэнтабельнай збожжавай вытворчасці і бавоўнаводства на

вырошчванне гародніны, тэхнічных культур і мяса. У той жа час вынікам значнага росту вытворчасці працы ў аграрным сектары стала вызваленне каля 80 млн. сельскіх працаўнікоў, якія склалі ядро працоўных калектываў зноў створаных пасялковых прамысловых прадпрыемстваў.

Сярод аб'ектыўных прычын, якія выклікалі пэўную затармажанасць у развіцці рэформы, належыць прызнаць значнае абмежаванне пасяўных плошчаў, слабасць матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі і ў першую чаргу вострую нястачу ўсіх відаў энергіі, неразвітасць транспартнай інфраструктуры. І ўсё ж у цэлым развіццё аграрнага сектара ў 1978—1988 гг. мела прагрэсіўны характар, тэмп прыросту асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі, такіх, як збожжа, бавоўна, алейныя культуры, мяса, значна апярэджваў рост насельніцтва краіны.

Поспех укаранення сістэмы вытворчай адказнасці быў прадвызначаны тым, што падворная падрадная сістэма адказнасці пакончыла з ураўнілаўкай у размеркаванні даходаў, цесна ўвязала асабістыя інтарэсы сялян з вынікамі працы, зрабіўшы іх па-сапраўднаму самастойнымі ў гаспадарчай дзейнасці. Вопыт аграрных пераўтварэнняў у кітайскай вёсцы паказвае, што на пэўным этапе развіцця сацыялістычнай эканомікі, яе вытворчых сіл скарыстанне індывідуальных формаў гаспадарання больш эфектыўна, чым калектыўных.

Вывучэнне і крытычнае асэнсаванне гэтага вопыту набывае важнае значэнне ў сувязі з перабудовай гаспадарчага механізма і пераводам эканомікі, у тым ліку і сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі, на рынячныя адносіны.

[1] Гл.: Statistical yearbook of China. Goncong, 1987. P. 143.
[2] Гл.: Алексеев И. А. и др. Американские китаеведы об экономике и политике Китая сегодня и завтра. М., 1989. С. 125.
[3] Гл.: Statistical yearbook of China. P. 109.
[4] Гл.: China Daily. 1988. January 6.
[5] Там жа.
[6] Гл.: Женьмінь жыбао. 1988. 14 студзеня.
[7] Гл.: Алексеев И. А. и др. Американские китаеведы... С. 129.
[8] Гл.: Энциклопедия нового Китая / Пер. с англ. М., 1989. С. 214.
[9] Гл.: Statistical yearbook of China. P. 143; China Daily. 1988. November 4.
[10] Гл.: XIII съезд КПК и реформа в Китае. Пекин, 1987. С. 60.
[11] Гл.: Deng Xiaoping Fundamental issues in present-day China. Beijping, 1987. P. 109.
[12] Гл.: Мост. Пекин, 1988. С. 21—22.
[13] Гл.: China Daily. 1989. January 6.
[14] Гл.: China Daily. 1988. December 7.
[15] Гл.: XIII съезд КПК и реформа в Китае. С. 44.

Е. Д. СМИРНОВА

## ЧЕШСКИЕ МАСТЕРА XVIII в. В РОССИИ

Разные причины заставляли представителей зарубежных славянских народов переселяться в Россию. Первопричиной чешской эмиграции были культурно-языковая дискриминация и религиозно-политические преследования славян в австрийской монархии.

Белогорское поражение 1620 г. привело к аннексии Чешских земель, утрате независимости землями чешской короны (Чехии, Моравии, Силезии). Австрийские Габсбурги насильственно превратили Чешские земли в провинцию своей полиэтнической монархии, что привело к наступлению феодально-клерикальной реакции, онемечиванию всех сфер общественной жизни. Культура чехов оказалась поставленной в маргинальное положение.

Помимо культурно-языковой дискриминации, религиозных преследований, к миграции подталкивали и такие факторы, как желание усовершенствовать свое мастерство за границей, невозможность найти работу на родине [1].

Эмиграция коснулась прежде всего деятелей чешской культуры. Появление в России выходцев из Чехии сыграло значительную роль в развитии чешско-русских культурных связей, в установлении непосредственных личных контактов между учеными, музыкантами, художниками, театральными деятелями двух славянских стран. Чешские мастера-музыканты появляются при Петре I и со временем становятся обычным явлением в русской музыкальной жизни. Обстоятельно освещено развитие чешско-русских музыкальных связей этого периода в сочинении Якоба Штелина «Музыка и балет в России XVIII в.»[2].